golosovanie-belarus-sleduet-mirovym-izbiratelnym-trendam_i_0000044855.html Дата доступа 13.08.2016

УДК 395.5

**Камунікацыя і інфармацыя ў традыцыйным грамадстве (на прыкладзе грамады беларускіх сялян у другой палове xix – пачатку xx стагоддзя)**

Карбалевіч Н.М.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Значнасць грамадскай камунікацыі ў жыцці чалавека цяжка перааацаніць. Гэта тычыцца як чалавека сучаснага, так і прадстаўніка традыцыйнага грамадства. У беларускай традыцыйнай культуры вызначальную ролю адыгрывалі звычаі і традыцыі, якія падрабязна рэгламентвалі камунікацыю сялян у межах грамады. Грамада ўяўляла сабой зачыненую камунікатыўную сістэму з высокай кантцэнтраванасцю стасункаў паміж людзьмі і інтэнсіўнай цыркуляцыяй інфармацыі. Ці можна ўвогуле казаць пра паняцце “інфармацыя” ў традыцыйным грамадстве альбо гэта характарыстыка толькі сучаснага “інфармацыйнага” ці “постінфармацыйнага” грамадства? Пад паняццем “інфармацыя” ў шырокім значэнні мы маем на ўвазе звесткі любой формы, якія штосьці паведамляюць, тлумачаць, ствараюць уяўленне і г.д. Безумоўна, тэрмін “інфармацыя” ў сучасным кантэксце існавання інфармацыйнага грамадства і інфармацыйных тэхналогій належыць цяперашнему часу. Але калі звяртаць увагу не на тэрміны, а на значнасць таго ці іншага ведання, дык традыцыйнае грамадства не саступала сучаснаму па той ролі, якую адыгрывала ў жыцці людзей сацыяльнае веданне.

У традыцыйным грамадстве паводзіны чалавека былі моцна дэтэрмінаваныя грамадскай культурай, якая панавала ў дадзеным сацыяльным асяродку, што праяўлялася ў існаванні і функцыянаванні традыцыйных пажаданых мадэляў паводзінаў і грамадскага ўзаемадзеяння. Традыцыйныя мадэлі паводзінаў уяўлялі сабой сацыякультурна зададзены пажаданы алгарытм дзеяння ў канкрэтных сацыяльных абставінах і таксама з’яўляліся свайго роду сацыяльна значнай інфармацыяй, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне.

Для традыцыйнай культуры сістэма рэгуляцыі ўзаемаданосін мела вызначальнае значэнне і была шчыльна звязаная з разуменнем правільнага ладу жыцця і парадку, на якім трымаецца грамадскае жыццё. Разнастайныя

формы і механізмы рэгуляцыі ўтваралі каркас традыцыйнай сацыяльнай культуры беларускіх сялян. Кожны селянін з дзяцінства засвойваў уласцівыя яго сацыяльнаму асяродку нормы паводзінаў. Існаванне нормаў паводзінаў было скіравана на падтрыманне цэласнасці і функцыянальнасці сацыяльнай сістэмы беларускіх сялян. Нормы паводзінаў у традыцыйным грамадстве стваралі адмысловую культуру зносінаў, замацоўвалі зразумелыя правілы паводзінаў. Грамада калектыўна ажыццяўляла грамадскі кантроль за тым, каб гэтыя нормы не парушаліся. Калі парушэнне адбывалася, грамада ажыццяўляла грамадскія санкцыі супраць парушальніка. Санкцыі за парушэнне нормаў паводзінаў натуральным чынам вынікалі з магчымасцяў грамадскага асяродку ў межах традыцыйнай зачыненай сацыяльнай сістэмы. Механізмы грамадскага кантролю характарызаваліся натуральнасцю свайго паходжання, маральнаю афарбоўкаю ўздзеяння, індывідуальным падыходам да кожнага выпадку.

Грамадскія ўзаемаадносіны сялян з’яўляліся арганічным складнікам любой сферы жыццядзейнасці грамады і ў кожнай з іх патрабавалі сваіх форм і механізмаў рэгуляцыі. Так, камунікацыя ў традыцыйным грамадстве падзялялася на абрадавую і неабрадавую, святочную і будзённую, працоўную і непрацоўную, камунікацыю ў межах розных узроставых груп і г.д. Традыцыйна найбольш рэгламентаванымі формамі камунікацыі з’яўляліся абрадавая камунікацыя грамады, а таксама камунікацыя моладзі, якая кантралявалася сталымі сялянамі.

Наяўнасць такога значнага элемента грамадскага жыцця беларускіх сялян як рэпутацыя пашырала рэгуляцыйную сістэму традыцыйнага сялянскага грамадства. Усеагульная дасведчанасць сялянскага асяродку аб жыцці, здольнасцях і якасцях кожнага яго члена з’яўлялася трывалай падставай для існавання і эфектыўнага функцыянавання рэпутацыі чалавека ў грамадзе. Пад рэпутацыяй маецца на ўвазе сукупнасць максімальна канкрэтных звестак, ці сучаснай мовай кажучы, інфармацыі, пра лад жыцця і асабістыя здольнасці кожнага селяніна, якія фіксаваліся грамадскім асяродкам. Можна зрабіць выснову, што ацэньваліся грамадой усе асаблівасці чалавека, як знешнія, так і ўнутраныя, яго ўчынкі, якасць яго працы. Вынікам грамадскай рэпутацыі чалавека часта з’яўлялася нададзеная яму грамадой мянушка. Асабліва ўражлівымі грамадскаму меркаванню ў традыцыйным грамадстве былі жанчыны. Сацыяльны асяродак традыцыйнага грамадства шчыльна апекаваўся бездакорнасцю асабістых рысаў і паводзінаў найперш маладых жанчын. Відавочна, што грамадская думка мела рэальныя рычагі ўплыву на жыццё сялян і цалкам рэалістычна магла змяніць чалавечы лёс. З улікам гэтага фактару сялянская камунікацыя карэктавалася яе ўдзельнікамі, каб не патрапіць пад асуджэнне

і пазбегнуць непатрэбных цяжкасцяў. Метафарчына сістэму ведаў грамады пра той ці іншы сялянскі род можна параўнаць з базай дадзеных, у якую патрапляе новая і новая інфармацыя праз паводзіны і якасці новых пакаленняў роду.

Таксама асабліва сацыяльна значнай для традыцыйнага грамадства з'яўлялася інфармацыя, якая дазваляла класіфікаваць суразмоўцу па прынцыпе "свой – чужы", што ключавым чынам уплывала на характар камунікацыі. Носьбітам такой інфармацыі магла быць вопратка чалавека, яго паводзіны, але асабліва яго маўленне.

Асноўным зместам грамадскіх узаемаадносінаў з'яўлялася непасрэдная камунікацыя праз маўленне. У традыцыйным грамадстве асаблівую ролю адыгрывалі сітуацыйныя слоўныя формулы. Яны з'яўляліся значным элементам, які канструяваў, падтрымліваў і трансляваў сацыяльную рэальнасць традыцыйнай беларускай вёскі. Сітуацыйныя слоўныя формулы былі значным структурным элементам практычна любага аспекту непасрэднай камунікацыі ў сялянскай культуры. Слоўнымі формуламі было прасякнута ўсё жыццё селяніна, яны з'яўляліся неад'емным элементам разнастайных сітуацый грамадскага ўзаемадзеяння. Акрамя таго, іх правільнае, адпаведнае сітуацыі ўжыванне з'яўлялася сацыяльным маркёрам прыналежнасці да той ці іншай грамадскай супольнасці, паколькі яны мелі лакальную варыятыўнасць і аб'ядноўвалі вясковую абшчыну ў адзіную сістэму камунікацый са сваімі асаблівасцямі і традыцыямі. Традыцыйная камунікатыўная культура беларускага сялянства ўтрымлівала разнастайныя тыпы сітуацыйных слоўных формул – прывітанні, развітанні, запрашэнні, падзякі, зычэнні, ахоўныя формулы, засцярогі, пракляцці і інш. Значная частка гэтых сітуацыйных слоўных формул мелі ў тым ліку і этыкетны характар.

Жыццё чалавека ў сялянскай грамадзе ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзяў з'яўлялася максімальна публічным. Публічная камунікацыя фактычна рабілася асноўным зместам, базавай катэгорыяй грамадскага жыцця, усеагульная дасведчанасць аб здольнасцях і жыцці кожнага селяніна, іншымі словамі, аб прыватнай інфармацыі чалавека, была асновай грамадскіх узаемаадносінаў. Сучаснае грамадства карыстаецца іншымі прынцыпамі камунікацыі і катэгорыямі інфармацыі, іншае значэнне набыло паняцце публічнасці, але і сучаснаму грамадству для пошукаў вырашэння складанасцяў, якія ўзнікаюць у сферы камунікацыі, карысным можа быць выкарыстанне ў тым ліку і камунікатыўнага досведу іншых эпох.